**ВЕКТАР РАЗВІЦЦЯ ПРАФСАЮЗА**
Пра вынікі працы арганізацыі за апошнія пяць гадоў
Стар. 2

**У БДУ НАЗВАНЫ ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ «НАЙЛЕПШЫ НАВУКОВЫ ГУРТОК – 2024»**
Узнагароды ўдастоіліся юрыдычны факультэт, а таксама факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі
Стар. 3

**ДЫНАСТЫІ БДУ**
Цыкл матэрыялаў, прысвечаны дынастыям студэнтаў і выкладчыкаў БДУ
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

29 лістапада 2024 года, № 11 (2289)

## БОЛЬШ ЗА 100 СТУДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ СТАЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАМІ ТЫДНЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ



**Тыдзень студэнцкай моладзі, прысвечаны 25-годдзю падпісання Дамовы пра стварэнне Саюзнай дзяржавы, стартаваў 18 лістапада ў БДУ. Форум прадугледжваў фарміраванне адзінай пляцоўкі для ўзаемадзеяння моладзі Беларусі і Расіі, абмену досведам і ідэямі па стварэнні студэнцкіх праектаў пра захаванне гістарычнай памяці і духоўна-маральных каштоўнасцяў.**

Пра значнасць мерапрыемства выказаўся рэктар Андрэй Кароль Па словах кіраўніка БДУ, моладзь заўсёды ўспрымальная да новых праектаў і асветніцкіх акцый, якія спрыяюць яе асобаснай і прафесійнай рэалізацыі. Таксама ён падкрэсліў ключавую асаблівасць тэматычнага тыдня. «Сёння мы становімся сведкамі разбурэння старой светабудовы, заснаванай на маналогу і дамінаванні аднаго канцавосся. Таму форум у першую чаргу накіраваны на фарміраванне сэнсаў і каштоўнасцяў кожнага юнага ўдзельніка праекта», – працягнуў думку Андрэй Кароль. Напрыканцы ён пажадаў усім прадуктыўнай працы, цікавых дыскусій і новых сяброў-аднадумцаў.

Таксама павітаў гасцей урачыстага мерапрыемства Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Барыс Грызлоў.

Пра партрэт сучаснага пакалення распавяла намеснік старшыні кіравання грамадскага аб’яднання «Беларускі фонд міру», першая жанчына-касманаўт Беларусі, Герой Беларусі Марына Васілеўская. Яна адзначыла, што сёння бачыць тэндэнцыю і запатрабаванне студэнтаў у пастаянным развіцці і самаўдасканаленні. «Самае галоўнае – гэта накіраваць дзяцей, паказаць, у якім рэчышчы трэба рухацца далей на карысць шчаслівай будучыні нашых краін», – падзялілася Марына Васілеўская. Таксама яна дадала, што Тыдзень студэнцкай моладзі Саюзнай дзяржавы – гэта маштабны праект, які даказвае сяброўства, сілу і інтэлектуальную моц Беларусі і Расіі.

Падчас форуму БДУ заключыў пяць пагадненняў аб узаемадзеянні і супрацоўніцтве ў галіне маладзевай палітыкі з шэрагам расійскіх універсітэтаў. У прыватнасці, завераны дакументы паміж БДУ і Уладзімірскім дзяржаўным універсітэтам імя А. Р. і М. Р. Сталетава, Валгаградскім дзяржаўным універсітэтам, Наўгародскім дзяржаўным універсітэтам імя Яраслава Мудрага, Пскоўскім дзяржаўным універсітэтам і Разанскім дзяржаўным універсітэтам імя С. А. Ясеніна.



Другі дзень форуму быў прысвечаны гістарычный памяці і праўдзе. Ключавой падзеяй стала дыялогавая пляцоўка з удзелам кіраўніцтва факультэтаў, супрацоўнікаў і даследчыкаў БДУ. Да прыкладу, пра агульную гісторыю як каштоўнасць Саюзнай дзяржавы студэнтам распавёў прафесар ФМА Андрэй Русаковіч. Вынікамі расследавання Генеральнай пракуратуры Беларусі крымінальнай справы пра генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны падзяліўся дацэнт гістарычнага факультэта Сяргей Александровіч. Таксама ўдзельнікі праекта абмяркавалі сучасныя тэндэнцыі распаўсюджання постпраўды. Тут з дакладам «Стварэнне фейкавых навін ва ўмовах развіцця штучнага інтэлекту» выступілі дэкан ФПМІ Юрый Арловіч і начальнік ваеннага факультэта Андрэй Бахар. Акрамя таго студэнты наведалі Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны.

Тэматыкай трэцяга дня мерапрыемства сталі сямейныя каштоўнасці сярод моладзі. Студэнты наведалі інтэрактыўныя лекцыі і круглыя сталы. Пра захаванне сямейных каштоўнасцяў з дапамогай медыяцыі распавяла дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ Аксана Здрок. Таксама ў гэты дзень адбылася дыялогавая пляцоўка «Сямейныя каштоўнасці – аснова духоўнага жыцця». Спікерам мерапрыемства выступіў намеснік старшыні Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы, протаіерэй Аляксандр Шымбалёў. Сімвалічнай часткай стаў паказ спектакля «Сямейны альбом» у выкананні артыстаў народнага студэнцкага музычна-драматычнага тэатра-студыі БДУ «На філфаку».

Духоўна-маральныя каштоўнасці Саюзнай дзяржавы абмеркавалі 21 лістапада. Госці наведалі музей Біблії Інстытута тэалогіі імя св. Мяфодзія і Кірыла БДУ і Храм-помнік ў гонар Усіх святых і ў памяць пра ахвяр, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны. Удзельнікам распавялі пра важнасць фарміравання маральнасці і духоўных арыенціраў у маладога пакалення. Таксама навучэнцы працягнулі знаёмства з падраздзяленнямі ВНУ на майстар-класах па каліграфіі і філасофіі, трэнінгах па псіхалогіі, выставе духоўна-маральных кніг і дызайнерскай пляцоўцы.

Фінальныя мерапрыемствы тыдня прайшлі 22 лістапада пад эгідай «Патрыятычных каштоўнасцяў Саюзнай дзяржавы». Адбылася сустрэча са старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцёмам Цуранам, намеснікам старшыні пастаяннай камісіі савета па сувязях з грамадскімі арганізацыямі, моладзевай палітыцы і працы са СМІ, першым сакратаром Мінскага гарадскога камітэта ГА «БРСМ» Раманам Бандаруком і старшынёй моладзевага савета пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў Уладзіславам Дземідзенкам. Таксама для ўдзельнікаў праграмы прайшлі прэзентацыі факультэтаў БДУ. Факультэт радыёфізікі і камп’ютарных тэхналогій прадставіў гасцям інтэрактыўную пляцоўку. Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ прэзентаваў экалагічны праект «Экасквер». Эканамічны факультэт правёў інтэрактыўную прэзентацыю «Эканоміка будучыні пачынаецца тут». Юрыдычны факультэт сумесна з юрыдычнай клінікай БДУ правялі віктарыну па прававым ракурсе студэнцкай моладзі Саюзнай дзяржавы. Таксама для студэнтаў была арганізавана інтэрактыўная экскурсія па факультэце журналістыкі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 лістапада 2024 года, № 11 (2289)

# ВЕКТАР РАЗВІЦЦЯ ПРАФСАЮЗА





**29 кастрычніка прайшла справаздачна-выбарная канферэнцыя пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БДУ. На ёй падвялі вынікі працы ППАР за апошнія пяць гадоў. Вынікам мерапрыемства стала перавыбранне Івана Янушэвіча, які на гэтай пасадзе з 2022 года, старшынёй арганізацыі.**

**Гісторыя прафсаюза ахоплівае ўвесь шлях універсітэта. За гэты час у ВНУ і дзяржаве адбылося шмат змен. Чым жа з'яўляецца прафсаюз БДУ сёння? У чым яго галоўная мэта?**

– На сучасным этапе адной з галоўных задач прафсаюза я б назваў аналіз і своечасовую рэакцыю на рэальныя і патэнцыйныя пагрозы праву чалавека на працу і годную заработную плату. Прафсаюз дапамагае шукаць аптымальныя рашэнні пытанняў, якія могуць узнікнуць у працэсе ўзаемадзеяння работнікаў і наймальніка. Нам няма патрэбы прымяняць радыкальныя спосабы адстойвання правоў працоўных. У нас выбудавана дакладная сістэма выканання іх правоў. У гэтым унікальнасць нашай краіны. І гэтая практыка цалкам адпавядае інтарэсам работнікаў.

Задача прафсаюза – адсочваць справядлівасць прынятых рашэнняў – загад на прэмію, водпуск або ўнясенне змяненняў у калектыўную дамову.

**Якія дасягненні прафсаюза за апошнія некалькі гадоў вы лічыце самымі значнымі?**

– Галоўным вынікам гэтай пяцігодкі з'яўляецца тое, што БДУ – вядучы ўніверсітэт краіны, вядомы далёка ў свеце.

## ФІНАНСАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ




І роля пярвічнай арганізацыі ў гэтым не малаважная, таму што 90% працаўнікоў – гэта члены прафсаюза. Мы ўсе працуем на тое, каб універсітэт меў магчымасць даваць нам годныя працоўныя месцы.

Што да нашай дзейнасці, за апошнія 5 гадоў яна была сканцэнтравана першым чынам на сацыяльнай падтрымцы. Гэты перыяд якраз выпаў на гады каранавіруса, і ў той час 80% бюджэту было накіравана на падтрымку нашых супрацоўнікаў. Каля 4000 чалавек у 2019–2020 гадах атрымалі матэрыяльную дапамогу.

Мы ўвесь час удасканальваемся і шукаем нішы, каб падтрымліваць у цяжкую хвіліну кожнага, хто мае патрэбу. Безупынна ідзе работа па павелічэнні выплат шматдзетным сем'ям, пенсіянерам. Так званы «залаты парашут», выплаты па сыходзе на пенсію, тым, хто сваю працоўную дзейнасць прысвяціў БДУ, павялічыліся прыкладна на 20%.

Варта адзначыць і турыстычную дзейнасць арганізацыі. За мінулы год 2115 супрацоўнікаў наведалі каля 50 экскурсій. А сёлета толькі са студзеня па кастрычнік іх было арганізавана 56. У нашай краіне шмат месцаў, якія трэба наведаць, і мы заўсёды стараемся самастойна распрацоўваць цікавыя маршруты. Цяпер мы фарміруем план паездак на 2025 год і канцэнтруем увагу на аб'ектах, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым годзе наша экскурсійная дзейнасць таксама адбывалася ў рамках 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мы наведалі амаль усе знакавыя месцы таго перыяду, ад Хатыні і яе абноўленага комплексу да экскурсій па партызанскіх сцежках і Брэсцкай крэпасці.

Таксама мы зрабілі крок наперад у сферы аздараўлення нашых супрацоўнікаў. Напрыклад, у жніўні ў САК «Брыганціна» адпачывала больш за 400 членаў арганізацыі

## МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА




## АХОПЛЕНАЯ Ў 2023 Г. АЎДЫТОРЫЯ (ЧАЛ.)




разам са сваімі дзецьмі. Таксама значна ўзрасла колькасць работнікаў, якія праходзяць аздараўленне ў прафсаюзных санаторыях краіны.

**Арганізацыя надае вялікае значэнне здароўю супрацоўнікаў. Можаце больш падрабязна расказаць пра спартыўную работу прафсаюза БДУ?**

– У гэтай сферы можна вылучыць тры асноўныя напрамкі. Першы напрамак – секцыі. На сёння каля 700 прадстаўнікоў універсітэта наведваюць групы «Здароўе». У гэтым годзе ў нас дзейнічаюць 17 напрамкаў, на якіх працуюць 25 прафесійных інструктараў. Любы член нашай арганізацыі можа зайсці на сайт прафкама і даведацца, як на іх запісацца. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца заняткі па плаванні.

Другое – штогадовая спартакіяда «Здароўе». Сёлета яна будзе праходзіць па 7 відах спорту. У ёй удзельнічаюць зборныя каманды падраздзяленняў і факультэтаў. Цяпер мы актыўна прыцягваем новых спартсменаў. У мінулым годзе далучылася каля 600 чалавек, задача на гэты год і на далейшыя падвоіць гэту лічбу. А секцыі – гэта базіс для пошуку тых людзей, якім падабаецца спорт.

Трэці напрамак спартыўна-масавай работы – раённыя і гарадскія спаборніцтвы. Камплектаванне каманд для ўдзелу ў іх – адна з задач спартакіяды «Здароўе». Ужо некалькі гадоў наша пярвічная прафсаюзная арганізацыя з'яўляецца пераможцам рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод устаноў вышэйшай адукацыі.

**Можаце падзяліцца планамі на будучыню і задачамі, якія стаяць перад прафсаюзам?**

– Па-першае, патрэбна завяршыць працэс фарміравання нашай вертыкалі. Кожны член прафсаюза павінен ведаць свайго лідара ў прафгрупе, у цэхавай арганізацыі і ў прафкаме. І наадварот, старшыня прафбюро, прафгрупарг павінны ведаць праблемы ўсіх сваіх падапечных, іх запыты, меркаванні наконт усяго кола пытанняў. Прафгрупарг павінен дайсці да кожнага. І гэта патрэбна для аператыўнага рэагавання разам з прадстаўнікамі адміністрацыі ці прафкама работнікаў. Дадзены механізм павінен працаваць як гадзіннік у нашай арганізацыі. Усё патрэбна рабіць для людзей. Па-другое, у нас добра наладжана праца на ўзроўні прафкама. Ладзяцца розныя мерапрыемствы, акцыі, інфармацыйная работа пастаянна ўдасканальваецца, чаго нельга яшчэ сказаць пра ўзровень актыўнасці ў нашых цэхавых арганізацыях. Асноўны патэнцыял менавіта там, і ёсць бачанне, як гэта здзейсніць. Вялікую ўвагу прафкам надае рабоце з моладдзю. У нас другі год запар ідзе практычна стопрацэнтнае далучэнне маладых спецыялістаў да прафсаюза, робяцца выніковыя захады для іх уцягвання ў працу і жыццё арганізацыі. 2 мая быў створаны моладзевы савет ППАР БДУ. Зараз у ім знаходзіцца каля 40 прадстаўнікоў ад цэхавых прафсаюзных арганізацый да 31 года. І менавіта яны ўжо займаюцца прасоўваннем нашых мерапрыемстваў у асяродку сваіх калег.

Мы даём маладым людзям магчымасць развівацца ў самых розных напрамках. На базе навучальна-метадычнага цэнтра Федэрацыі прафсаюзаў рэгулярна адбываецца навучанне моладзевага актыву. Таму першачарговай задачай, апрача відавочных, я лічу павышэнне цікавасці маладых спецыялістаў да нашай дзейнасці.

**Ганна КАЗАКОВА**

# У БДУ НАЗВАНЫ ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ «НАЙЛЕПШЫ НАВУКОВЫ ГУРТОК – 2024»

**Галоўнае ўпраўленне навукі БДУ кожны год праводзіць конкурс на найлепшы навуковы гурток. Перамогу сёлета ў намінацыі «прыродазнаўчыя навукі» атрымаў картаграфічны гурток факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, а ў намінацыі «гуманітарныя навукі» – «Канстытуцыйнае права» юрыдычнага факультэта.**

Мэта конкурсу – павышэнне якасці адукацыі, падрыхтоўка большай колькасці кваліфікаваных навукоўцаў, падтрымка таленавітых студэнтаў і магістрантаў, а таксама дапамога ім у прасоўванні сваіх навуковых ідэй. Адораная моладзь працуе не ў адзіночку, а разам з навуковымі кіраўнікамі сваіх кафедраў.

Сам конкурс дзеліцца на дзве часткі. Першы этап праходзіць у падраздзяленнях з 1 па 31 мая. Кожнае падраздзяленне самастойна вызначае найлепшы гурток, улічваючы спецыфіку сваёй навуковай галіны і метадыкі работы з адоранымі студэнтамі. Пераможца прадстаўляе факультэт на наступны этапе конкурсу – універсітэцкім.

Другі этап складаецца з візуальнай часткі. Да 1 мая ўдзельнікі ўніверсітэцкага этапу конкурсу павінны прадставіць сяміхвілінны відэаролік, які дэманструе дасягненні іх навуковага гуртка. Відэа павінна змяшчаць інфармацыю пра яго, дзейнасць кіраўніка, навуковыя вынікі, інавацыйныя ідэі, кар'еру і склад выпускнікоў. Дарэчы, каб навуковы гурток сапраўды лічыўся такім, яму павінна быць не менш за год, а колькасць удзельнікаў – ад 5 і больш.

Сем гурткоў выйшлі ў фінал універсітэцкага этапу з больш чым 120 навуковых аб'яднанняў БДУ, у якіх у гэтым годзе ўдзельнічала больш за 2600 студэнтаў. Але толькі два самыя лепшыя сталі абсалютнымі пераможцамі.



## ПЕРАМОЖЦЫ ПРА СВАЕ ДАСЯГНЕННІ

Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі атрымлівае першае месца не ўпершыню. У мінулым годзе яны таксама сталі пераможцамі ў галіне прыродазнаўчых навук з аб'яднаннем «Terra Cognita». А сёлета перамаглі разам з картаграфічным навуковым гуртком кафедры геадэзіі і космааэракартаграфіі. З гэтай нагоды перамогу пракаментаваў навуковы кіраўнік і старшы выкладчык кафедры Вячаслаў Пейхвасер:

– Гурток у лідарах конкурсу БДУ ўжо даўно, ён неаднаразова выходзіў у фінал, а перамаглі ўжо другі раз. Усе ўспрынялі гэту перамогу як заслужанае прызнанне за выкананую работу, асабліва ў гэтым годзе.

## АДКАЗНАСЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПЕРАД САБОЙ

Значным стымулам сталі юбілейныя даты ў геаграфічнай супольнасці:

– Намі была праведзена напружаная і якасная работа ў год 90-годдзя факультэта, 70-годдзя Беларускага геаграфічнага таварыства і 55-годдзя кафедры. Мы робім вялікі ўпор як на навукова-даследчыя работы і кірунак публікацыйнай актыўнасці, так і на павышэнне іміджу спецыяльнасці «космааэракартаграфія» і правядзенне шырокай выставачнай дзейнасці. Мы таксама супрацоўнічаем з Беларускім геаграфічным таварыствам па распаўсюджванні геаграфічных ведаў і прадстаўленні старадаўніх карт і аўтэнтычных геадэзічных інструментаў шырокаму колу беларускай грамадскасці.

Гурток праводзіць штомесячныя пасяджэнні з вядучымі спецыялістамі, выкладчыкамі і г.д., на якіх абмяркоўваюцца актуальныя пытанні картаграфіі, геадэзіі і дыстанцыйнага зандзіравання, а таксама вынікі студэнцкіх даследаванняў. Студэнты актыўна ўдзельнічаюць ва ўніверсітэцкіх і міжнародных канферэнцыях (больш за 20 за два гады), і нават праходзілі стажыроўкі ў вядучых замежных універсітэтах і даследчых цэнтрах. Сёння ў гуртку 62 студэнты, 4 магістранты і 2 аспіранты.

Разам з факультэтам гурток часта арганізоўвае картаграфічныя выставы ў розных месцах – Нацыянальная бібліятэка, цэнтральны дзіцячы парк. Студэнты праектуюць і складаюць карты, апрацоўваюць космааэраздымкі і даследуюць нашу Беларусь.

## ПЕРАМОГА НЕ ТОЛЬКІ ГУРТКА, АЛЕ І ЎСЯГО ФАКУЛЬТЭТА

У гэтым годзе ў галіне гуманітарных навук перамог гурток «Канстытуцыйнае права» юрыдычнага факультэта. Ён паспяхова працуе на кафедры канстытуцыйнага права БДУ з 2002 года.

Гэты студэнцкі навуковы саюз збірае студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў юрыдычнага факультэта, якія займаюцца даследаваннямі ў сферы канстытуцыйнага права. У рамках дзейнасці аб'яднання ажыццяўляецца садзейнічанне навукова-даследчай рабоце студэнтаў пры падрыхтоўцы выступленняў на пасяджэннях гуртка, дакладаў на навуковых і навукова-практычных канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню, студэнцкіх навуковых работ. Ён дапамагае маладым даследчыкам удасканальваць навыкі публічных выступленняў і рыхтаваць навуковыя публікацыі. А за два дзесяцігоддзі стаў не проста навуковай супольнасцю, а сапраўднай школай для будучых экспертаў у галіне канстытуцыйнага права.

Кіраўнікі гуртка – загадчык кафедры канстытуцыйнага права **Рыгор Васілевіч** і дацэнт гэтай жа кафедры **Таццяна Маслоўская** – актыўна ўдзельнічаюць у жыцці студэнтаў. Таму перамога для іх была не толькі вынікам дзейнасці самога гуртка, але і дасягненнем усяго факультэта:



– Для нас гэта быў адначасова вялікі гонар, але і сур'ёзная адказнасць – паспрабаваць свае сілы ў гэтым конкурсе, улічваючы, што юрыдычны факультэт актыўна ўцягнуты ў арганізацыю навуковай работы студэнтаў, на нашым факультэце функцыянуе 21 навуковы гурток, з іх на кафедры канстытуцыйнага права – 3. Безумоўна, гэта было пачуццё поспеху за юрыдычны факультэт, кафедру канстытуцыйнага права, усіх тых, хто прысвячае сябе навуковвй працы – выкладчыкаў, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў. Я ўпэўнена, што перамога нашага гуртка агульная для ўсяго юрыдычнага факультэта, – дзеліцца сваімі ўражаннямі Таццяна Маслоўская.

Як кажуць кіраўнікі, факультэт усімі сіламі падтрымлівае іх ініцыятывы адносна развіцця навуковай дзейнасці. Калегі і студэнты выказалі самыя шчырыя віншаванні, пажадаўшы гуртку новых перамог.

Таццяна Маслоўская адзначае, што дасягненне гуртка – гэта вынік сумеснай кафедральнай работы са студэнтамі, бо ўсе выкладчыкі перыядычна ўдзельнічаюць, выступаючы з дакладамі, прапаноўваючы тэмы для абмеркавання на пасяджэннях, рыхтуючы студэнтаў да выступленняў. Але асаблівую ролю адыгрывае галоўны кіраўнік гуртка – доктар юрыдычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, загадчык кафедры канстытуцыйнага права Рыгор Васілевіч:



– Я ўспамінаю пачатак сваёй работы ў гуртку, калі Рыгор Аляксеевіч займаў пасаду Старшыні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, і пры ўсёй сваёй занятасці заўсёды імкнуўся ўдзельнічаць у яго пасяджэннях, прапаноўваў для разгляду актуальныя тэарэтычныя пытанні, практычныя казусы, садзейнічаў фарміраванню навуковага дыялогу ў фармаце роўнасці яго прадстаўнікоў, вольнага выказвання свайго навуковага меркавання. Яго вялікі прафесійны вопыт, прававыя веды выступаюць арыенцірам, які накіроўвае студэнтаў на навуковую дзейнасць. За мінулы перыяд наш студэнцкі навуковы гурток дасягнуў значных вынікаў.

Гурток па канстытуцыйным праве дапамагае студэнтам самастойна вывучаць прававыя пытанні і працаваць у камандзе. Яны абмяркоўваюць змены канстытуцыйнага заканадаўства, прапануюць шляхі яго ўдасканалення, удзельнічаюць у сустрэчах з прадстаўнікамі дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь (Канстытуцыйны Суд, Парламент і інш.), а яшчэ звязваюцца з экспертамі з расійскіх універсітэтаў і праводзяць анлайн-канферэнцыі. Таксама выкарыстоўваюцца выступленні, дыскусіі, прававыя гульні і інш.

Дарэчы, усе гурткі адкрытыя для ўсіх, таму з задавальненнем прымаюць у свае шэрагі новых студэнтаў!

**Таццяна САВІЦКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 лістапада 2024 года, № 11 (2289)

# ДЫНАСТЫЯ КОШАЛЕВЫХ: 77 ГАДОЎ З БДУ



**Дынастыю Кошалевых складаюць доктар навук, прафесар, кандыдат навук, дацэнт, загадчыкі кафедраў, аўтары навуковых і навукова-метадычных прац. Педагагічны стаж дынастыі Кошалевых у БДУ дасягае 77 гадоў.**

**Уладзімір Сяргеевіч Кошалеў** – загадчык кафедры гісторыі новага і найноўшага часу, доктар гістарычных навук, прафесар. Педагагічны стаж у БДУ – 56 гадоў.

Нарадзіўся 1 чэрвеня 1947 года ў вёсцы Сасноўка Пружанскага раёна. У 1963–1967 гадах вучыўся на гістарычным факультэце БДУ. Прайшоў усходазнаўчую падрыхтоўку ў Інстытуце ўсходніх моў (з 1974 года Інстытут краін Азіі і Афрыкі) пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава ў 1968–1970 гадах і ў Каірскім універсітэце ў 1971–1972 гадах. У 1970 годзе стаў выкладчыкам кафедры гісторыі новага і найноўшага часу БДУ. У 1974 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Унутрыпалітычная барацьба ў Егіпце ў першыя гады Другой сусветнай вайны (1939–1942)». У 1977 годзе выйшла першая манаграфія У. С. Кошалева «Егіпет да Эль-Аламейна: з гісторыі ўнутрыпалітычнай барацьбы (1939–1942)». У 1986 годзе праходзіў стажыроўку ў Цэнтры па правах чалавека ААН у Жэневе. У 1988 годзе ў Інстытуце краін Азіі і Афрыкі пры МДУ абараніў доктарскую дысертацыю «Сацыяльна-палітычная барацьба і антыкаланіяльны рух у Егіпце (1879–1924)». У 1989 годзе ўзначаліў кафедру гісторыі новага і найноўшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1990 годзе яму было прысвоена навуковае званне прафесара. У 1995 годзе праходзіў навуковую стажыроўку ў Джорджтаўнскім універсітэце.

Прафесар У. С. Кошалеў – усходазнавец, з'яўляецца спецыялістам па гісторыі арабскіх краін і палітычнага ісламу, даследуе метадалагічныя і тэарэтычныя праблемы сусветнай гісторыі, міжнародных адносін.

Аўтар каля 300 навуковых і навукова-метадычных прац, у тым ліку 5 манаграфій, больш чым 60 навучальных праграм і дапаможнікаў па сусветнай гісторыі для базавай і сярэдняй школы. Асноўныя манаграфічныя даследаванні прысвечаны новай і найноўшай гісторыі Егіпта. Ён адзін з аўтараў 6-томнай «Гісторыі Усходу» (Інстытут усходазнаўства Расійскай акадэміі навук, 1994–2006) і навукова-папулярнага выдання «Гісторыя Карэі з найстаражытных часоў» (2019). Падрыхтаваў вялікую групу спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі – 10 дактароў і 38 кандыдатаў навук, у тым ліку з Балгарыі, В'етнама, Ірака, Турцыі і Палесціны.

У 2001–2003 гадах – навуковы кіраўнік Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў «Глабальны свет». З 2003 па 2020 год з'яўляўся адным з навуковых кіраўнікоў Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя і культура». Стаяў ля вытокаў стварэння ВАК Рэспублікі Беларусь, узначальваў экспертны савет па гістарычных навуках, член прэзідыума ВАК з 2009 па 2016 год. Старшыня і намеснік старшыні спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх дысертацый пры БДУ ў 1995–2004 гадах. Член рэдкалегіі 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі». Уваходзіць у склад рэдкалегіі і рэдакцыйных саветаў гістарычных часопісаў «Беларускі гістарычны часопіс», «Гісторыя: праблемы выкладання», «Вышэйшая школа» і інш. Па лініі міжнародных арганізацый выступаў у якасці эксперта па палесцінскай праблеме.

За працоўныя заслугі У. С. Кошалеў ганараваны звання «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», узнагароджаны медалём Ф. Скарыны, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Двойчы ганараваны персанальнай надбаўкі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «за выбітны ўнёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі». Мае падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і рэктара БДУ. Выдатнік вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь. Заслужаны работнік БДУ. Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты пры БДУ ў галіне гуманітарных навук.



**Наталля Уладзіміраўна Кошалева** – загадчыца кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Дачка Кошалева У. С. Педагагічны стаж у БДУ – 21 год.

Нарадзілася ў 1978 г. У 2000 г. скончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2003 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Мусульманская абшчына і ісламскія арганізацыі ЗША ў XX стагоддзі» ў БДУ. З 2003 г. працуе на кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ. У 2007 г. стала старшым выкладчыкам. У 2010 г. Н. У. Кошалевай прысвоена званне дацэнта. У 2009–2015 гг. узначальвала савет маладых навукоўцаў гістарычнага факультэта. З 2020 г. з'яўляецца адказнай за НДРСА гістарычнага факультэта. У 2024 г. абрана загадчыцай кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

Спецыялізуецца на гісторыі ісламу і мусульманскай абшчыны ва ўмовах чужога сацыякультурнага асяроддзя (ЗША, Заходняя Еўропа), займаецца пытаннямі ісламізму, салафізму, феноменам ісламскага праекта «ісламізацыі ведаў» і ў цэлым праблемамі ісламазнаўства, а таксама гісторыяй Карэі і краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Прайшла навуковую стажыроўку ва Усходне-кітайскім педагагічным універсітэце (Шанхай, КНР) у 2012 г., у рамках якой прыняла ўдзел у адкрыцці Кітайска-беларускага культурнага цэнтра.

Прайшла навуковую стажыроўку (2002, 2012) у Інстытуце даследавання школьных падручнікаў імя Георга Экерта (Браўншвейг, Германія). Удзельнічала ў рэалізацыі нямецка-беларускага праекта (2000–2004) па стварэнні навучальнага дапаможніка па сусветнай гісторыі XX стагоддзя (навуковы кіраўнік праекта – У. С. Кошалеў). З 2017 г. брала ўдзел у праграмах «Эразмус+»: «Эразмус+ праграма для выкладання і навучання» (Цюбінгенскі ўніверсітэт, Цюбінген, Германія, 10–18 ліпеня); «Эразмус+ КА2 праграмны праект ФОСТЭРК па распрацоўцы і ўкараненні навучальнай праграмы для магістратуры» (Літоўскі педагагічны ўніверсітэт, Вільнюс, Літва, 2018, 12–14 чэрвеня; Мінск, 2018–2019). Удзельнічала ў міжнародным праекце «Супольнасць спецыялістаў па напісанні школьных падручнікаў у Рэспубліцы Беларусь» пад эгідай Акадэміі карэязнаўства (Рэспубліка Карэя, 2017–2019). У рамках праекта праводзіла навуковае даследаванне ў Рэспубліцы Карэя (Санам, 2017).

Аўтар больш чым 100 навуковых і метадычных прац, у тым ліку навучальных дапаможнікаў па ўсеагульнай гісторыі для сярэдніх школ Рэспублікі Беларусь, адзін з аўтараў навукова-папулярнай кнігі «Гісторыя Карэі з найстаражытных часоў» (2019).

Дынастыя Кошалевых зрабіла вялікі ўнёсак у развіццё гістарычнай навукі і падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

# ДЫНАСТЫЯ ТАМАШЭВІЧАЎ: 100 ГАДОЎ З БДУ

**Дынастыю Тамашэвічаў складаюць дактары навук, прафесары, загадчыкі кафедраў, аўтары навуковых прац. Педагагічны стаж дынастыі Тамашэвічаў у БДУ складае 100 гадоў.**





Тамашэвіч А. У. (трэці злева)

**Тамашэвіч Уладзімір Антонавіч** – доктар эканамічных навук, дацэнт, рэктар БДУ ў 1946–1949 г. Педагагічны стаж у БДУ – 45 гадоў.

Нарадзіўся 22 лютага 1899 года ў Мінску. У 1921 годзе быў накіраваны ў Камуністычны ўніверсітэт імя Я. М. Свярдлова ў Маскве, які скончыў у 1924 годзе па спецыяльнасці «адміністрацыйнае права». З 1929 па 1932 год працаваў намеснікам рэктара па навучальнай частцы і загадчыкам кафедры савецкай эканомікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1938–1941 гадах працаваў загадчыкам кафедры палітычнай эканоміі Усесаюзнага завочнага фінансава-эканамічнага інстытута (Масква). У 1941–1942 гадах знаходзіўся на фронце, у 1942 годзе быў паранены, лячыўся ў шпіталі. У 1942–1944 гадах працаваў дацэнтам кафедры палітэканоміі Маскоўскага інстытута інжынераў транспарту, з 1944 па 1946 год быў сакратаром мінскага абкама КП(б)Б, а таксама загадчыкам кафедры палітэканоміі Мінскага педагагічнага інстытута. З 1946 па 1949 год працаваў рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, з 1948 па 1965 год – загадчыкам кафедры палітэканоміі. Спрыяў таму, што БДУ атрымаў права абароны кандыдацкіх дысертацый па палітэканоміі. За гэты перыяд на кафедры было абаронена каля 20 кандыдацкіх дысертацый. Выпускнікі-аспіранты складалі аснову кафедры і пасля сталі вядомымі ў краіне навукоўцамі-эканамістамі.

У 1949–1950 гадах абраны сакратаром ЦК КП(б)Б. У 1953 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Індустрыяльнае развіццё БССР у перыяд першай пяцігодкі». З 1954 па 1956 год праходзіў дактарантуру ў Маскве. Тэма доктарскай дысертацыі – «Сацыялістычная індустрыялізацыя БССР». Да 1974 г. працаваў дацэнтам кафедры палітэканоміі БДУ.

Асноўным напрамкам даследаванняў У. А. Тамашэвіча была індустрыялізацыя народнай гаспадаркі Беларусі. Апублікаваў каля 30 навуковых артыкулаў, падрыхтаваў больш за 10 кандыдатаў эканамічных навук.

Уладзімір Антонавіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна, медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», медалём «За абарону Масквы», медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», медалём «За працоўнае адрозненне».



**Тамашэвіч Аляксандр Уладзіміравіч** (сын Тамашэвіча У. А.) – доктар геаграфічных навук, прафесар. Педагагічны стаж у БДУ – 32 гады.

Нарадзіўся 13 жніўня 1930 г. у Мінску. У 1949–1954 гг. навучаўся на геолага-геаграфічным факультэце БДУ. Пасля заканчэння ўніверсітэта з 1954 да 1960 гг. працаваў у сістэме Белгалоўгеа-логіі на пасады ад прараба-геолага да начальніка партыі геолага-гідрагеалагічнай экспедыцыі. Затым два гады ў Дзяржплане БССР ён займаецца планаваннем геолагаразведачных прац на нафту і цвёрдыя карысныя выкапні, рэгіянальных здымачных і пошукавых прац. З 1962 г. А. У. Тамашэвіч становіцца аспірантам Інстытута эканомікі АН Беларусі, а ў 1965 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Эканамічная ацэнка карысных выкапняў». Далейшая яго праца доўгія гады была звязана з Беларускім навукова-даследчым геолагаразведачным інстытутам (БелНДГРІ). У 1979 г. ён быў прызначаны намеснікам дырэктара БелНДГРІ па навуковай рабоце. У 1984 г. паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Праблемы павышэння эфектыўнасці падрыхтоўкі і прамысловага выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў Беларусі». У 1988 г. яму было прысвоена званне прафесара.

Амаль 16 гадоў з 1987 па 2002 г. загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін. З 2002 па 2014 гг. працаваў на пасадзе прафесара кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін.

За добрасумленную працу і поспехі ў працы А. У. Тамашэвіч быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, знакамі «Выдатнік разведкі нетраў», «Выдатнік адукацыі», бронзавым медалём ВДНГ СССР, сярэбраным знакам і дыпломам XXVII Міжнароднага геалагічнага кангрэса, ганаровымі граматамі Мінгеалогіі СССР, Белгалоўгеалогіі, Белдзяржуніверсітэта. Пад кіраўніцтвам прафесара Тамашэвіча А. У. было абаронена 5 кандыдацкіх дысертацый. Апублікаваў больш за 100 навуковых прац.

**Тамашэвіч Анжаліка Уладзіміраўна** (нявестка Тамашэвіча А. У.) – вядучы спецыяліст па арганізацыі навучальнага працэсу факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій. Педагагічны стаж у БДУ – 2 гады, агульны стаж працы ў БДУ – 23 гады.

У 1996 г. скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, геаграфічны факультэт, па спецыяльнасці географ-эколаг, выкладчык.

З 1999 г. па 2001 г. працавала ў ДУ НДІ статыстыкі пры Міністэрстве статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь на пасадзе навуковага супрацоўніка ў аддзеле аператыўных даследаванняў мікраэканамічных, сацыяльных і экалагічных працэсаў. З 2001 г. па 2004 г. навучанне ў аспірантуры на кафедры эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці БДУ, спецыяльнасць – эканамічная, сацыяльная і палітычная геаграфія. З 2023 г. выкладчык кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій.

Галіна навуковых інтарэсаў – геаграфія і эканоміка-геаграфічная ацэнка мінеральных рэсурсаў, інфармацыйныя камп'ютарныя тэхналогіі ў адукацыі. Мае 25 навуковых публікацый.

Дынастыя Тамашэвічаў папоўніла шэрагі таленавітых навукоўцаў БДУ. Даследаванні аўтараў з'яўляюцца актуальнымі і на дадзены момант.

**Дар'я АРТАМОНАВА**

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» упершыню прыме ўдзел у Міжнародным індыйскім кінафестывалі ў Гоа. У рамках міжнароднай фестывальнай праграмы ў секцыі «From the consulate» пакажуць фільм «Чорны замак», які прадставіць прадзюсар і генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый Аляксей.

У Беларусі скарэкціравалі дзяржаўную праграму па ўладкаванні ваенных гарадкоў на 2021–2025 гады. Дзяржаўная праграма прынята для прывядзення ў належны стан матэрыяльна-тэхнічнай базы і элементаў добраўпарадкавання ў ваенных гарадках Узброеных Сіл Беларусі.

На пасяджэнні другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання адобраны праект закона «Аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да Статута Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай абароны».

Першы рэспубліканскі фестываль творчасці дзяцей і моладзі з парушэннем слыху «Каўчэг шчаслівага дзяцінства» прайшоў у Рэспубліканскім палацы культуры імя М. Ф. Шарко грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх». Удзельнікамі фестывалю сталі калектывы спецыяльных школ для дзяцей з парушэннямі слыху з усёй краіны і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Мінска.

Мінскі дзяржаўны каледж лічбавых тэхналогій упершыню набраў на навучанне дзяцей з расстройствам аўтыстычнага спектра (РАС), паведаміў дырэктар каледжа Георгій Козел удзельнікам пасяджэння Рэспубліканскага міжведамаснага савета па правах інвалідаў пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі.

Італьянскі сад канца XVI – пачатку XVII стагоддзя аднаўляюць у музеі «Замкавы комплекс „Мір"». Работа пачалася з даследаванняў, праведзеных у цесным супрацоўніцтве з навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену (РЦЭ) для вучняў 11-х класаў школ Беларусі адбудзецца 8 лютага. Вызначыцца з прадметам РЦЭ школьнікам неабходна да 13 снежня. Далей школы самастойна рэгіструюць сваіх выпускнікоў на іспыты. Рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену пройдзе ў адпаведнасці з інструкцыяй аб правядзенні самога ЦЭ.

Беларускія палярнікі прыступілі да выканання навуковых праграм у Антарктыдзе. У гонар адкрыцця 17-га антарктычнага сезона на флагштоках Беларускай антарктычнай станцыі «Гара Вячэрняя» ўзняты дзяржаўны сцяг Беларусі і сцяг НАН.

Прадстаўнікі Міністэрства лічбавага развіцця, інавацый і аэракасмічнай прамысловасці Казахстана з працоўным візітам наведалі Беларусь. Асноўная мэта прыезду – вывучэнне і абмен вопытам у сферы геадэзіі, картаграфіі, дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і землеўпарадкавання. Вынікам сустрэчы стала падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве.

Універсітэт
29 лістапада 2024 года, № 11 (2289)

# «Гэта часам цяжка, часам балюча, але заўсёды натхняе»: Кацярына Панцялеева пра працу педагога-псіхолага

**Як тлумачыць Кацярына, існуе мноства фактараў, характэрных для студэнцкага жыцця, якія ўплываюць на зварот да спецыяліста.**

Першы год універсітэта – гэта перыяд адаптацыі да самастойнасці, што часта выклікае цяжкасці. Новае асяроддзе, новыя адносіны, пошук месца ў калектыве могуць выклікаць няўпэўненасць і трывожнасць. Некаторыя маюць цяжкасці ў адносінах з бацькамі, сябрамі, што можа пагаршаць працэс адаптацыі.

– Студэнты сутыкаюцца з высокімі патрабаваннямі і пастаяннымі дэдлайнамі падчас адукацыйнага працэсу. Акрамя таго, яны часта адчуваюць фінансавую нестабільнасць, – адзначае псіхолаг. – Праца псіхалагічнай службы мае вялікае значэнне для жыцця кожнага чалавека. Мы вучым, як спраўляцца са стрэсам, трывогай і іншымі негатыўнымі эмоцыямі, а таксама адаптавацца да новага асяроддзя і паспяхова вучыцца. Уся дапамога аказваецца бясплатна, уключаючы кансультацыі, групавую працу і прафілактычныя праграмы.

Найбольш актуальнай тэмай для групавой працы з'яўляецца камандаўтварэнне. Тут спецыялісты службы дапамагаюць маладым людзям знаёміцца адзін з адным, умацоўваць сваю прыналежнасць да ўніверсітэцкай супольнасці і ўдзельнічаць у грамадскім жыцці.

Акрамя таго, тэмы прафілактыкі стрэсу і трывогі, кіравання часам і нармалізацыі здаровага ладу жыцця таксама цікавяць нашых навучэнцаў.

Нягледзячы на тыповасць большасці праблем, не існуе адзінага рэцэпта, які дапаможа ўсім. Адаптацыя да ўніверсітэцкага жыцця – гэта індывідуальны працэс, таму важна прымяняць і агульныя стратэгіі, і індывідуальны падыход.

Існуе меркаванне, што псіхолаг можа вырашыць усе праблемы чалавека. Але гэта не так. Педагог-псіхолаг дапамагае чалавеку ўсвядоміць праблему або накіроўвае да іншых спецыялістаў, калі гэта неабходна. Як адзначае Кацярына, важна зразумець пачуцці чалавека і пры гэтым не ставіцца адмоўна да яго стану.

Важна памятаць, што клопат пра ментальнае здароўе – гэта цяжкая, але вельмі важная місія.

Поспех у працы педагога-псіхолага заключаецца ў супрацоўніцтве з іншымі спецыялістамі з мэтай падтрымаць студэнта.

Псіхолагу важна клапаціцца і пра сваё ўласнае псіхічнае здароўе. Спецыяліст не можа працаваць, калі сам адчувае моцны стрэс або ператамленне.

– Прафесіяналізм і багаты вопыт практычнай работы спрыяюць пошуку вырашэнняў няпростых праблем, бо галоўная ўзнагарода для мяне – бачыць, як людзі становяцца больш упэўненымі і шчаслівымі, – менавіта так Кацярына Міхайлаўна бачыць сэнс сваёй працы.

Гераіня адзначае, што ў людзей існуюць некаторыя стэрэатыпы ў разуменні тэрапіі.

– Часцей за ўсё я сутыкаюся з меркаваннем, што «студэнцкія праблемы несур'ёзныя». Ёсць думка, што клопаты моладзі – гэта проста «восенькая хандра» або «лёгкі непакой», якія пройдуць самі сабой. Аднак гэта не заўсёды так. Студэнты могуць адчуваць цяжкасці са здароўем, адносінамі, фінансамі.

Лічыцца, што моладзь не хоча наведваць псіхолага з-за сораму або страху асуджэння. Гэта міф. Насамрэч, многія звяртаюцца да спецыялістаў, але не афішыруюць гэта. Каб пазбавіцца сораму, трэба больш падрабязна і даступна тлумачыць асноўныя палажэнні Закона аб псіхалагічнай дапамозе. У прыватнасці, хто такі педагог-псіхолаг, чым ён займаецца ва ўніверсітэце, як да яго трапіць. Такім чынам выбудоўваецца станоўчае стаўленне да псіхалагічнай дапамогі. Трэба разумець, што ментальнае здароўе – гэта важны аспект паспяховай вучобы і жыцця ў цэлым.

Але што перашкаджае чалавеку прыйсці да псіхолага? Кацярына мяркуе, што шмат студэнтаў адкладваюць тэрапію, таму што ёсць «больш значныя справы». Акрамя таго, існуе стэрэатып, што паход да псіхолага – гэта прызнанне істотных псіхалагічных праблем. Таму маладыя людзі баяцца, што праз гэта іх асудзяць, будуць успрымаць па-іншаму. Акрамя таго, часам людзі проста не ведаюць, куды ісці пры неабходнасці. Таму спецыялісты псіхалагічнай службы БДУ размяшчаюць інфармацыю з даведкамі пра сябе і пра службу ў навучальных карпусах, інтэрнатах і сацыяльных сетках.



Важна памятаць, што зварот па дапамогу не прыкмета слабасці, а крок да вырашэння праблемы.

– Калі адсутнічае магчымасць размовы са спецыялістам, можна паспрабаваць патлумачыць свой стан родным, блізкім і сябрам, да якіх ёсць давер. Іх падтрымка можа значна аблегчыць вашы перажыванні, – дае параду псіхолаг. – Важна запісваць свае думкі і пачуцці. Гэта дапаможа лепш зразумець, што адбываецца. Я рэкамендую выйсці на вуліцу, прагуляцца ў парку, паслухаць музыку, заняцца спортам, схадзіць у тэатр або ў кіно. Таксама варта паспрабаваць медытацыю або тэхнікі рэлаксацыі. Яны дапамогуць супакоіцца і ў далейшым лепш кіраваць сваімі эмоцыямі.

Як і любы іншы чалавек, Кацярына таксама адчувае стрэс і цяжкасці. Але, на шчасце, у яе на ўзбраенні ёсць мноства методык захавання раўнавагі. Педагог-псіхолаг стараецца канцэнтравацца на пазітыўных аспектах сваёй працы і жыцця ў цэлым. Акрамя таго, яна выкарыстоўвае творчасць як спосаб выказвання эмоцый. Пастаяннае вывучэнне новай літаратуры, азнаямленне з вынікамі даследаванняў і ўдасканаленне сваіх навыкаў дапамагае заставацца ў тонусе і спраўляцца з новымі выклікамі.

– Я вельмі люблю размаўляць з людзьмі і пазнаваць нешта новае. Так я захоўваю матывацыю і натхненне, якое можна знаходзіць у розных крыніцах: прыродзе, музыцы, мастацтве, навуцы. У кожнага чалавека ўнікальная гісторыя, непаўторны набор перажыванняў і ўражанняў.

Праца псіхолагам дазваляе Кацярыне бачыць свет вачыма іншага чалавека. Гэта часам цяжка, часам балюча, але заўсёды натхняе. А калі бачыш вынік працы – вельмі прыемна.

– У цэлым, мая праца – нешта накшталт пошуку сэнсу ў велізарнай плыні інфармацыі. Я стараюся зрабіць інфармацыю даступнай і карыснай для людзей, дапамагаючы ім.

Кацярына кажа, што самы важны ўрок з яе прафесійнай дзейнасці – перакананасць, што чалавек неверагодна складаны і шматгранны, ён адчувае вялікі спектр эмоцый і пачуццяў.

Важна паважаць кожнага чалавека як асобу, прымаць яго такім, які ён ёсць. Нашы эмоцыі ўплываюць на нашы паводзіны, думкі і ўчынкі. Адкрытыя і шчырыя зносіны дазваляюць лепш разумець адзін аднаго.

За апошнія гады прафесійнай практыкі педагог-псіхолаг адзначае пэўныя змены. Студэнты становяцца больш смелымі, адкрытымі, узаемадзейнічаюць з людзьмі, удзельнічаюць у праектах рознага маштабу і абменьваюцца ведамі.

У цэлым, жыццё ва ўніверсітэце становіцца больш дынамічным. Аднак разам з гэтым паўстаюць новыя выклікі, якія патрабуюць усвядомленага падыходу і распрацоўкі новых стратэгій для паспяховай адаптацыі да зменлівага свету.

Важнасць псіхалагічнай падтрымкі ва ўніверсітэцкай прасторы не выклікае сумненняў. Дзякуючы прафесіяналізму і клопату супрацоўнікаў псіхалагічнай службы, навучэнцы БДУ могуць атрымаць неабходную дапамогу ў розных жыццёвых сітуацыях. Мы спадзяёмся, што Кацярына Панцялеева сваім прыкладам праліла святло на важную працу, якую выконваюць педагогі-псіхолагі. Знайсці кантакты і падрабязнасці работы сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы ўпраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю БДУ можна на сайце ўніверсітэта. Памятайце, што спецыялісты заўсёды гатовы працягнуць руку дапамогі і вы ніколі не застанецеся сам-насам з праблемамі.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

# ПЕРШАКУРСНІКІ З ЗАМЕЖНЫХ КРАІН ЗНАЁМЯЦЦА З БДУ

**У БДУ для замежных першакурснікаў прайшоў традыцыйны праект Welcome Week BSU, арганізаваны саветам зямляцтваў і УВРМ.**

Савет зямляцтваў ужо доўгі час з'яўляецца буферам паміж студэнтамі з іншых краін і кіраўніцтвам універсітэта ў самых розных пытаннях. Ён штогод арганізоўвае такія святы, як Дзень нацыянальных культур, фестываль «Наўруз», заўсёды падтрымлівае студэнтаў у іх пачынаннях і імкненнях – робіць усё, каб навучанне ў чужой для іх краіне праходзіла камфортна.

У савет уваходзяць 8 зямляцтваў: Туркменістан, Кітай, Узбекістан, Таджыкістан, Казахстан, Азербайджан, Расія і краіны Афрыкі.

Welcome Week BSU праходзіць ужо чацвёрты год. Ініцыятыва накіравана на дапамогу ў адаптацыі замежных навучэнцаў у час знаходжання ў Беларусі, а таксама ўмацаванне ўзаемаразумення і сяброўства паміж студэнтамі.

Удзельнікамі акцыі сталі 45 першакурснікаў з розных факультэтаў. Яны прадстаўляюць Азербайджан, Расію, Кітай, Казахстан і Туркменістан.

На працягу чатырох дзён яны наведвалі сустрэчы і дыялогавыя пляцоўкі з прадстаўнікамі ўпраўленняў па выхаваўчай рабоце з моладдзю, міжнародных сувязяў, справах культуры і Студэнцкага гарадка БДУ.

У першы дзень у сценах факультэта міжнародных адносін першакурснікі пазнаёміліся з саветам зямляцтваў і яго асноўным кіраўніцтвам, даведаліся пра структуру арганізацыі і мерапрыемствы, якія іх чакаюць.

– Для нас важна праводзіць Welcome Week BSU яшчэ і таму, што так мы знаходзім новых удзельнікаў савета зямляцтваў, якія працягнуць нашу справу і пасля будуць дапамагаць іншым замежным першакурснікам, – дзеліцца старшыня савета Ахмед Таўсуланаў.

Потым для ўдзельнікаў правялі дыялогавую пляцоўку з начальнікам упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю Аляксеем Шавелем, які расказаў пра ідэалагічную працу ўніверсітэта.

Таксама куратары праекта паклікалі на тымбілдынг з інтэрактыўнымі гульнямі, каб хлопцы і дзяўчаты лепш пазнаёміліся адзін з адным.

Не ўсе першакурснікі з Кітая добра размаўляюць па-руску, але гэта ім не перашкодзіла, бо ўсю інфармацыю для іх перакладаў намеснік старшыні савета зямляцтваў Вэй Юйкэ.

Пад канец дня першакурснікі адправіліся на экскурсію ў музей землязнаўства БДУ, дзе ім паказалі ўніверсітэцкую калекцыю мінералаў.

Другі дзень быў не менш насычаным. З самай раніцы студэнты падключыліся да дыялогу з намеснікам начальніка аддзела міграцыйнага ўліку і суправаджэння замежных навучэнцаў Аляксеем Багамазавым. Яны даведаліся пра юрыдычныя тонкасці жыцця ў Беларусі, абавязкі і правы грамадзян іншых краін.

Пасля студэнты накіраваліся ў музей гісторыі БДУ. Там іх пазнаёмілі з экспазіцыяй і расказалі пра жыццё ўніверсітэта з самых першых дзён заснавання.

На вывучэнні мінулага не спыніліся. Потым у навучэнцаў была магчымасць даведацца пра сучаснае культурнае жыццё навучальнай установы. Намеснік начальніка ўпраўлення па справах культуры Аксана Чупрына расказала ім пра творчыя аб'яднанні, мерапрыемствы, святы і падзялілася, як можна паўдзельнічаць у іх арганізацыі.



На наступны дзень удзельнікам традыцыйна расказалі пра правілы пражывання ў інтэрнатах. Намеснік начальніка Студэнцкага гарадка і старшыня савета інтэрнатаў студгарадка адказалі на пытанні студэнтаў і папярэдзілі пра наступствы правапарушэнняў.

Пасля гэтага са студэнтамі сустрэліся прадстаўнікі псіхалагічнай і сацыяльна-педагагічнай службы БДУ. На сустрэчы ўдзельнікі мерапрыемства даведаліся, якую падтрымку і дапамогу яны могуць атрымаць, і правялі квест-гульню.

– З году ў год у нас праходзяць дыялогавыя пляцоўкі на самыя важныя тэмы, у якіх варта разбірацца першакурснікам. Наш праект дапамагае замежнікам адаптавацца да жыцця ў БДУ. Акрамя знаёмства са структурай універсітэта, вывучэння патрэбных рэчаў, студэнты проста размаўляюць, знаёмяцца і ў далейшым падтрымліваюць кантакты, дапамагаюць адзін аднаму, – распавядае сакратар савета зямляцтваў чацвёртакурсніца юрыдычнага факультэта Вераніка Заблоцкая.

У заключны дзень для ўдзельнікаў арганізавалі экскурсію ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

Завяршыўся Welcome Week BSU урачыста. Студэнты падзяліліся сваімі ўражаннямі, расказалі, што ім больш за ўсё спадабалася, што было карысным, а пасля атрымалі сертыфікаты ўдзельнікаў.

– Больш за ўсё запомніліся экскурсіі, на якія мы хадзілі. Асабліва наведванне Нацыянальнай бібліятэкі. Мяне ўразіў яе маштаб. Такіх бібліятэк няма ў нас на радзіме. Мне ўвогуле падабаецца краіна. Да паступлення я тут не бывала, але чытала пра Беларусь у інтэрнэце. Усё аказалася так, як расказвалі. Тут чыста і вельмі талерантны народ, – распавядае першакурсніца з Туркменістана Ірада Якубава.

Першакурснікі прызнаюць, што Welcome Week BSU – важнае мерапрыемства для тых замежнікаў, якія толькі знаёмяцца з краінай, дзе будуць вучыцца некалькі гадоў. Яны ўдзячныя арганізатарам за магчымасць пасябраваць з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі, абмяняцца сваім вопытам і абмеркаваць актуальныя пытанні, звязаныя з навучальным працэсам і іх культурнай інтэграцыяй. Бо веды, атрыманыя на сустрэчы, дапамогуць ім лягчэй адаптавацца і больш упэўнена пачувацца ў новым адукацыйным асяроддзі.

**Ганна КАЗАКОВА**

# НОВЫ СЕКТАР КІБЕРБЯСПЕКІ Ў БДУ: АДКАЗ НА ВЫКЛІКІ ЛІЧБАВАГА СВЕТУ

**У навукова-даследчым інстытуце прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі (НДІ ППМІ) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта створаны новы навукова-даследчы сектар, накіраваны на вырашэнне актуальных праблем інфармацыйнай бяспекі.**

## АКТУАЛЬНАСЦЬ ПРАБЛЕМЫ

У сучасным свеце кібербяспека перастала быць проста пажаданай мерай засцярогі. Зараз гэта неабходная аснова для бяспечнага функцыянавання як асобных людзей, так і цэлых дзяржаўных сістэм. Нашы жыцці цяпер непарыўна звязаны з інтэрнэтам і лічбавымі тэхналогіямі. Пагрозы шматстайныя: ад простых фішынгавых спасылак да складаных хакерскіх нападаў на дзяржаўныя інфраструктуры. Страта асабістых і фінансавых дадзеных, зрыў працы арганізацый, палітычныя маніпуляцыі — гэта толькі невялікі спіс магчымых небяспек недастатковай абароны.

Стварэнне цэнтра абумоўлена імклівым ростам колькасці кібератак, а гэта патрабуе навуковага асэнсавання праблемы і распрацоўкі эфектыўных сістэм процідзеяння.

## МІЖНАРОДНЫ КАНТЭКСТ

Новы аддзел БДУ закліканы запоўніць прабел у даследаваннях кібербяспекі ў Беларусі. Навукова-даследчы сектар у НДІ ППМІ БДУ стане адным з першых у краіне, якія спецыялізуюцца на дадзенай тэматыцы. Гэтая галіна актыўна развіваецца па ўсім свеце. Напрыклад, у Расіі такія даследаванні вядуцца ў Інстытуце камп'ютарных тэхналогій і інфармацыйнай бяспекі Паўднёвага федэральнага ўніверсітэта і іншых вядучых ВНУ.

## ФУНКЦЫЯНАЛ ЦЭНТРА

Спецыялісты сектара будуць займацца комплексным даследаваннем праблемы інфармацыйнай бяспекі: выяўляць уразлівасці ў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях, распрацоўваць сучасныя метады абароны аперацыйных сістэм, прагназаваць магчымыя кіберпагрозы, а таксама мадэляваць і фармальна аналізаваць крыптаграфічныя пратаколы, якія забяспечваюць надзейнасць абмену дадзенымі. Такім шляхам можна гарантаваць канфідэнцыяльнасць, цэласнасць і аўтэнтыфікацыю ў розных лічбавых узаемадзеяннях.

Вынікі працы цэнтра знойдуць прымяненне не толькі ў навуковай сферы, але і ў практыцы. Атрыманыя веды будуць выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў дадзенай галіны ў БДУ, а распрацаваныя метады абароны могуць быць укаранёны ў розных арганізацыях для абароны іх інфармацыйных рэсурсаў.

Адкрыццё сектара — важны крок па ўмацаванні інфармацыйнай бяспекі Беларусі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у гэтай крытычна важнай сферы.

**Марыя КАРКВЕЛІС**

УНІВЕРСІТЭТ
29 лістапада 2024 года, № 11 (2289)

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| Загадчык | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў |
| | [2] На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыя, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| Прафесар | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| Дацэнт | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |
| Старшы выкладчык | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў не менш за 3 гады, ці вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорый «Кіраўнік» ці «Спецыяліст», праца якіх адпавядае напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |

[1] (дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

Інстытут бізнесу БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры маркетынгу | 3 гады |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203; да 28 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213; да 27 студзеня.

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: дэканат факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (каб. 509 галоўнага корпуса БДУ, пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск); да 28 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: каб. 518 галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск); да 27 студзеня.

### УСТАНОВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА «НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ»

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне вакантнай пасады загадчыка навукова-даследчага сектара кібербяспекі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 427, НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-51-04.

Гістарычны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 28 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103; да 27 студзеня.

Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры камп'ютарнага мадэлявання | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры агульнай фізікі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 28 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г, Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 27 студзеня.

Факультэт міжнародных адносін аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Выкладчык кафедры ўсходазнаўства | - |
| Старшы выкладчык кафедры ўсходазнаўства | - |
| Старшы выкладчык кафедры мытнай справы і міжнароднай лагістыкі | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 504; да 28 снежня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 20, каб. 516; да 27 студзеня.

# КОМПЛЕКСНЫЯ ВУЧЭННІ ПА ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНЕ ПРАЙШЛІ Ў БДУ

**На працягу двух дзён у ВНУ праходзілі прафілактычныя мерапрыемствы па адпрацоўцы навыкаў, удасканаленні дзеянняў у выпадку надзвычайнай сітуацыі (НС) тэхнагеннага характару і па ліквідацыі яе наступстваў.**

Вучэнні аб'ядналі каля 400 супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ. У першы дзень для іх арганізавалі тэарэтычныя заняткі па пытаннях выканання тэхнікі бяспекі, мер засцярогі пры ўзнікненні пазаштатнай сітуацыі, па выкарыстанні індывідуальных сродкаў абароны.

Таксама прайшла штабная трэніроўка для адпрацоўкі атрыманых ведаў на практыцы і навыкаў суладнай каманднай працы. У прыватнасці, былі змадэляваны сітуацыі буйных пажараў, выкідаў небяспечных злучэнняў у паветра, рознага роду аварый на прамысловых аб'ектах і інш.

Другі дзень уключаў заняткі па аказанні першай медыцынскай дапамогі (вул. Курчатава, 5). Удзельнікам вучэнняў прадэманстравалі, як правільна спыняць крывацёк, рабіць штучнае дыханне, непрамы масаж сэрца, накладваць шыну і інш.

Адзначым, правядзенне падобных прафілактычных мерапрыемстваў дазваляе на практыцы даследаваць бягучую падрыхтоўку БДУ да ўзнікнення НС, а таксама ацаніць дзеянні грамадзянскіх фарміраванняў універсітэта ў дадзеных умовах.

Арганізатарам вучэнняў выступае штаб грамадзянскай абароны БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**







УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 29.11.2024 г.
Зак. 976. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*